Вучэбная праграма складзена на аснове Чахоўскі, Г.К, Чахоўская, Т.Л.. Беларуская мова як замежная: Вучэбная праграма для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія. Мн., 2008. Зацверджана рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта В.І. Стражавым 10.04.2008. Рэгістрацыйны № УД-1132/р.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
________________ сучаснай беларускай мовы __________________
(назва кафедры)

21 мая 2013 г. Пратакол № 10
(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры
________________ З.І. Бадзевіч
(подпіс)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта_____Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта______
(назва вышэйшай навучальнай установы)

30 мая 2013 г. Пратакол № 6
(дата, нумар пратакола)

Старшыня
________________М.М. Хмяльніцкі
(подпіс)

## Тлумачальная запіска

Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай (лінгваметодыка) як вучэбная дысцыпліна забяспечвае тэарэтычную і практычную падрыхтоўку выкладчыкаў мовы. Яна рэалізуецца ў форме лекцый і практычных заняткаў, аб’ём і змест якіх вызначаецца адпаведнымі праграмамі, у працэсе педагагічнай практыкі, пры напісанні і абароне курсавых, выпускных і дыпломных работ.

Курс лінгваметодыкі складаюць наступныя раздзелы.

1. Лінгвадыдактычныя асновы навучання. У межах гэтага раздзела разглядаюцца: змест методыкі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны, яе сувязь з іншымі навукамі, метады даследавання, сістэма навучання, якая ўключае мэты і задачы, прынцыпы, метады, сродкі, арганізацыйныя формы навучання, тлумачэнне базісных катэгорый методыкі і яе тэрмінасістэма.
2. Метадычныя асновы навучання сродкам зносін (фанетычным, лексічным, граматычным, стылістычным, краіназнаўчым).
3. Метадычныя асновы навучання камунікацыйнай дзейнасці (аўдзіраванню, вуснаму маўленню, чытанню, пісьму і пісьмоваму маўленню, перакладу).
4. Арганізацыя і забеспячэнне працэсу навучання (планаванне заняткаў, віды заняткаў, кантроль у навучанні мове, формы пазааўдыторнай работы, сучасныя тэхналогіі навучання мове).
5. Змест прафесіяграмы выкладчыка і патрабаванні да прафесіі выкладчыка.
6. Этапы, узроўні і профілі навучання беларускай мове як замежнай.
7. Асноўныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай мовы як замежнай.

У выніку азнаямлення з асноўнымі палажэннямі курса студэнты атрымліваюць веды аб тым, як вызначаюцца мэты навучання мове (якім павінен быць вынік вучэбнай дзейнасці), як можна акрэсліць змест навучання (чаму вучыць), якія прыёмы і метады забяспечваюць авалоданне мовай у вызначаны для гэтага часавы інтэрвал (як вучыць), якія сродкі варта выкарыстаць для дасягнення пастаўленых мэтаў і рэалізацыі запланаванага зместу навучання (пры дапамозе чаго вучыць).

Курс лінгваметодыкі забяспечвае фарміраванне ў студэнтаў беларусістаў – будучых выкладчыкаў – прафесійнай кампетэнцыі (здольнасці да навучання мове ў выніку азнаямлення з прыёмамі і метадамі яе выкладання) і камунікацыйнай кампетэнцыі ў іх будучых навучэнцаў (здольнасці да практычнага прымянення замежнай для іх мовы).

## Праграма вучэбнага курса

Лінгваметодыка як вучэбная дысцыпліна. Раздзелы і аспекты лінгваметодыкі. Агульныя, прыватныя, спецыяльныя методыкі. Лінгваметодыка як навуковая дысцыпліна. Навучанне і яго аспекты. Стратэгіі засваення вучэбнага матэрыялу. Лінгваметодыка і лінгвадыдактыка. Тэрмінасістэма лінгваметодыкі. Прадмет лінгваметодыкі. Аб’ект лінгваметодыкі. Лінгваметодыка як практычная дысцыпліна. Паняцце тэхналогіі навучання.

Метады даследавання ў лінгваметодыцы. Метады, якія выкарыстоўваюцца на эмпірычным узроўні: аналіз навукова-метадычнай літаратуры, навуковае назіранне, абагульненне педагагічнага вопыту, гутарка, доследнае навучанне, анкетаванне, тэставанне, хранаметраванне, статыстычны аналіз эксперыментальных вынікаў. Метады, якія выкарыстоўваюцца на тэарэтычным узроўні: абстрагаванне, аналіз і сінтэз, кампарацыя (параўнанне), дэдукцыя і індукцыя, мадэляванне, экстрапаляцыя.

Праблема ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай. Памежныя ўзроўні валодання мовай: узровень А – элементарнае валоданне мовай, узровень Б – свабоднае валоданне мовай, узровень В – дасканалае валоданне мовай. Сістэма дэскрыптараў для апісання ўзроўняў. Рэалізацыя ўзроўняў А, Б і В паводле чатырох відаў маўленчай дзейнасці (слуханне, маўленне, чытанне, пісьмо). Беларуская, расійская і агульнаеўрапейская сістэмы ўзроўняў: агульнае і адметнае. Шкала ўзроўняў валодання беларускай мовай (профіль вну): элементарнае валоданне мовай (элементарны ўзровень, базавы ўзровень, памежны (БМЗ-1) узровень); свабоднае валоданне мовай (прамежкавы (БМЗ-2) узровень, прасунуты (БМЗ-3) узровень, звышпрасунуты (БМЗ-4) узровень); дасканалае валоданне мовай (прафесійны (БМЗ-5) узровень, дасканалы (БМЗ-6) узровень). Міжнародныя экзамены і сертыфікаты па замежных мовах і па беларускай мове як замежнай. Самаацэнка ўзроўню камунікацыйнай кампетэнцыі.

Сістэма навучання і сістэмны падыход. Характарыстыка сістэмы навучання БМЗ: функцыянальнасць, складанасць, адкрытасць, адаптыўнасць сістэмы. Тры ўзроўні сістэмы навучання БМЗ: макрападыход, навучанне канкрэтнай мове, мікрападыход. Функцыянаванне сістэмы навучання БМЗ. Віды працэсу навучання ў залежнасці ад узаемадзеяння выкладчыка і навучэнцаў (кантактнае (стацыянарнае) і дыстантнае (завочнае) навучанне; арыентаванае на выкладчыка і арыентаванае на навучэнцаў). Віды працэсу навучання ў залежнасці ад спосабаў яго арганізацыі (актыўнае і інфарматыўнае навучанне). Віды працэсу навучання ў залежнасці ад зместу навучання (кантэкстнае і пазакантэкстнае навучанне). Віды працэсу навучання ў залежнасці ад рэалізацыі ў навучанні прынцыпу свядомасці (інтуітыўнае і свядомае навучанне). Віды працэсу навучання ў залежнасці ад узаемадзеяння.

Профілі навучання беларускай мове як замежнай. Паняцце профілю навучання. Дашкольны профіль. Школьны профіль. Падрыхтоўчы профіль. Філалагічны профіль. Сістэма падрыхтоўкі студэнта-філолага: практычныя, прафесійныя, пазнаваўчыя, выхаваўчыя мэты навучання. Функцыянальна-семантычны і фармальна-структурны падыходы да адбору і прэзентацыі матэрыялу. Уключаны профіль (уключанае навучанне). Нефілалагічны профіль. Спецыфіка навучання беларускай мове як замежнай у навучальных установах нефілалагічнага профілю. Курсавы профіль. Павышэнне кваліфікацыі. Завочны профіль. Дыстанцыйнае навучанне беларускай мове як замежнай. Віды дыстанцыйнага навучання ў вну з улікам тэлекамунікацыйных тэхналогій: дадатковае навучанне (вну – Інтэрнет – вну), змешанае навучанне (навучэнец – Інтэрнет – выкладчык), камунікацыйнае навучанне (навучэнец – Інтэрнет-цэнтр), асноўнае навучанне (навучэнец – Інтэрнет).

Падыход да навучання як лінгваметадычная катэгорыя. Наяўныя класіфікацыі падыходаў да навучання. Падыходы з пункту гледжання аб’екта навучання (моўны, маўленчы, маўленчадзейнасны). Падыходы з пункту гледжання спосабу навучання (непасрэдны (інтуітыўны), свядомы (кагнітыўны), дзейнасны, цэнтраваны на навучэнцах (педагогіка супрацоўніцтва)). Сацыякультурны падыход і яго спецыфіка.

Паняцце мэты навучання. Віды мэтаў навучання (практычная, агульнаадукацыйная, выхаваўчая, развіццёвая, стратэгічная (глабальная)). Практычная мэта навучання.

Прадметныя (сферы зносін – побытавая, вучэбная, сацыяльна-культурная, вытворча-прафесійная, афіцыйна-справавая; тэмы і сітуацыі зносін – сям’я, вольны час, горад, вёска, нацыянальныя традыцыі і звычаі і інш.; камунікацыйныя інтэнцыі зносін – кантактныя, інфарматыўныя, ацэначныя і інш.), моўныя (фанетыка, графіка, арфаграфія, марфеміка і словаўтварэнне, лексіка, марфалогія, сінтаксіс), маўленчыя (аўдзіраванне, маўленне, чытанне, пісьмо, пераклад), вучэбныя (праца з кнігай, канспектаванне, карыстанне тэхнічнымі сродкамі навучання і інш.), сацыякультурныя (краіназнаўчыя, лінгвакраіназнаўчыя, сацыякультурныя), прафесійныя (інфарматыўныя, рэгулятыўныя, ацэначныя і інш.) задачы навучання

Змест навучання беларускай мове як замежнай. Структура зместу навучання: сродкі зносін (фанетычныя, лексічныя, граматычныя, краіназнаўчыя, лінгвакраіназнаўчыя); веды; навыкі і ўменні; сферы, тэмы, сітуацыі зносін; тэксты як матэрыяльная аснова зместу навучання. Прынцыпы адбору зместу навучання. Змест навучання ў залежнасці ад аб’екта навучання і засваення: мова – веды, маўленне – навыкі, маўленчая дзейнасць – уменні, культура – міжкультурная камунікацыя. Фонавыя веды. Маўленчы этыкет. Віды кампетэнцый (лінгвістычная, сацыялінгвістычная (маўленчая), дыскурсіўная, стратэгічная, сацыяльная, сацыякультурная, прадметная, прафесійная, стратэгічная (кампенсаторная)). Размежаванне паняццяў *кампетэнцыя* і *кампетэнтнасць*. Камунікацыйная кампетэнцыя як вынік навучання (засваення мовы). Памылкі сацыякультурнага, лінгвакраіназнаўчага і псіхалагічнага характару. Прычыны сацыякультурных памылак і фактары, што спрыяюць іх з’яўленню. Прадметны бок зместу навучання. Умоўна-маўленчыя (вучэбныя) і маўленчыя сітуацыі зносін. Тэкст як адзінка зместу навучання. Аўтэнтычныя (неадаптаваныя) і вучэбныя (адаптаваныя) тэксты і іх роля ў навучальным працэсе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

| №п/п | Назвы раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Аўдыторныя | | | | Самаст. работа |
| | | Лекцыі | Практыч., семінар. | Лаб. заняткі | КСРС | |
| 1. | Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай (БМЗ) як комплексная дысцыпліна. | 2 | | | | 5 |
| 2. | Узроўні валодання мовай. | 2 | 2 | | | 5 |
| | Усяго: | 4 | 2 | | | 10 |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай (БМЗ) як комплексная дысцыпліна.** | **2** | | | | | | |
| 1.1 | 1. Лінгваметодыка як вучэбная дысцыпліна. Раздзелы і аспекты лінгваметодыкі. Агульныя, прыватныя, спецыяльныя методыкі.<br>2. Лінгваметодыка як навуковая дысцыпліна. Навучанне і яго аспекты. Стратэгіі засваення вучэбнага матэрыялу.<br>3. Лінгваметодыка і лінгвадыдактыка. Тэрмінасістэма лінгваметодыкі.<br>4. Прадмет лінгваметодыкі. Аб’ект лінгваметодыкі.<br>5. Лінгваметодыка як практычная дысцыпліна. Паняцце тэхналогіі навучання.<br>6. Праграма па БМЗ. Яе асноўныя аспекты. Тэрмінасістэма БМЗ | 2 | | | | DVD-матэрыялы, курс лекцый | [1]-[20] | Вуснае апытванне |
| **2.** | **Узроўні валодання мовай.** | **2** | **2** | | | | | |
| 2.1 | 1. Узровень А – элементарнае валоданне мовай, узровень Б – свабоднае валоданне мовай, узровень В – дасканалае валоданне мовай.<br>2. Сістэма дэскрыптараў для апісання ўзроўняў. Рэалізацыя ўзроўняў А, Б і В паводле чатырох відаў маўленчай дзейнасці (слуханне, маўленне, чытанне, пісьмо). | 2 | 2 | | | DVD-матэрыялы, курс лекцый | [1], [4], [8], [10], [13] | Пісьмовы тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Беларуская, расійская і агульнаеўрапейская сістэмы ўзроўняў: агульнае і адметнае.<br>4. Профілі навучання БМЗ. | | | | | | | |

## Асноўная і дадатковая літаратура

### Асноўная літаратура

1. Азимов, Э.Г., Щукин, А.Н. Словарь методических терминов (теория и практика преподавания языков) / Э.Г. Азимов, А.Н. Щукин. Санкт-Петербург, 1999.
2. Будай, В.Г. Русский с алфавита / В.Г. Будай. Минск, 2003.
3. Гаворым па-беларуску: Вучэб. дапам. па бел. мове для замежн. навучэнцаў / Пад рэд. Л.І.Сямешкі. – Мн., 1999.
4. Гальскова, Н.Д. Современная методика обучения иностранным языкам / Н.Д. Гальскова. Москва, 2000.
5. Кривицкий, А.А., Михневич, А.Е., Подлужный А.И. Белорусский язык для говорящих по-русски / А.А. Кривицкий, А.Е. Михневич, А.И. Подлужный. Минск, 1990.
6. Кривицкий, А.А., Подлужный, А.И. Учебник белорусского языка: Для самообразования / А.А. Кривицкий, А.И. Подлужный. Минск, 1994.
7. Культура і гісторыя беларусаў: Тэксты і заданні: Вучэб. дапам. па практыцы беларускага маўлення для замежных студэнтаў / Аўт.-склад. С.А. Важнік, І.І. Савіцкая. Мінск, 2003.
8. Лебединский, С.И., Гончар, Г.Г. Русский язык как иностранный: Типовая программа / С.И. Лебединский, Г.Г. Гончар. Минск, 2005.
9. Миньяр-Белоручев, Р.К. Методический словник: толковый словарь терминов методики обучения языкам / Р.К. Миньяр-Белоручев. Москва, 1996.
10. Михневич, А.Е. Русско-белорусский разговорник / А.Е. Михневич. Минск, 1991.
11. Міхневіч, А.Я., Навічэнка, Н.М. Англа-беларускі размоўнік / А.Я. Міхневіч, Н.М. Навічэнка. Мінск, 1992.
12. Настольная книга преподавателя иностранного языка. Минск, 2001.
13. Рамза, Т.Р. Беларуская мова? З Задавальненнем! / Т.Р. Рамза. Мінск, 2010.

### Дадатковая літаратура

14. Праграмы спецыяльных курсаў па спецыялізацыі “Беларуская мова як замежная” / Аўт.-склад. В.М. Ляшук, Л.І. Сямешка, А.А. Пацехіна і інш. Мінск, 2000.
15. Практыкум па методыцы выкладання беларускай мовы / З.Б. Варановіч, Л.І. Гамеза, С.І. Крылова, І.М. Саматыя. Мінск, 1998.
16. Раманцэвіч, В. Пачаткі роднае мовы / В. Раманцэвіч. Мінск, 1993.
17. Методика преподавания русского языка как иностранного / О.Д. Митрофанова, В.Г. Костомаров и др. Москва, 1990.
18. Ревуцкий, О.И. Лингвистический анализ художественного текста / О.И. Ревуцкий. Минск, 1998.
19. Солганик, Г.Я. Стилистика текста / Г.Я. Солганик. Москва, 1997.
20. Слоўнік тыпу INSITU беларускай мовы: Слоўнік, граматычны даведнік і збор тэкстаў для вывучаючых беларускую мову / А.І. Дабралюбаў, Н.В. Маргун, Н.У. Машэда і інш. Мн., 2003.
21. Супрун, А.Е. Исследования по лингвистике текста: Сб статей / А.Е. Супрун. Минск, 2001.
22. Тураева, З.Я. Лингвистика текста / З.Я. Тураева. Ленинград, 1991.
23. Чумак, Л.Н. Синтаксис русского и белорусского языков в аспекте культурологии / Л.Н. Чумак. Минск, 1997.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Сучасная беларуская мова | Кафедра сучаснай беларускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 10 ад 21 мая 2013 г. |
| Методыка выкладання беларускай мовы | Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур | няма | |

ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры (пратакол № ____ ад ________ 200_ г.)

Загадчык кафедры

_________________________ ________________ ____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_________________________ ________________ ____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)